Родная газета на родной мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУССКАЯ ГАЗЕТА

5 ЧЭРВЕНЯ 2009 г.
ПЯТНІЦА
№ 102
(26460)

Кошт 600 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

Прамая лінія

БОЛІ Ў ПАЗВАНОЧНІКУ?

Якія хваробы пагражаюць сёння пазваночніку, як засцерагчыся ад іх і як змагацца з імі? Гэтай тэме прысвечана наша чарговая «прамая лінія». У ёй возьмуць удзел спецыялісты РНПЦ траўматалогіі і артапедыі: **загадчык лабараторыі траўматычных пашкоджанняў пазваночніка і спіннога мозгу кандыдат медыцынскіх навук Андрэй Мікалаевіч МАЗУРЭНКА,** а таксама **загадчык лабараторыі захворванняў і наступстваў траўмаў пазваночніка і спіннога мозгу кандыдат медыцынскіх навук Андрэй Уладзіміравіч БАБКІН. «Прамая лінія» адбудзецца 9 чэрвеня, у аўторак, з 16.00 да 17.00 па тэлефонах: (8 017) 292 38 92 і 292 38 21. Папярэднія пытанні можна пакінуць па нумарах 8(017) 287 18 36 (Вольга Шаўко) і 287 17 57 (Сяргей Грыб).**

Ізраіль можа аказаць падтрымку Беларусі ў нармалізацыі адносінаў з Еўропай і ЗША

Такую думку выказаў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 4 чэрвеня на сустрэчы з намеснікам прэм'ер-міністра Дзяржавы Ізраіль — міністрам замежных спраў Авігдорам Ліберманам.

«Ізраіль для Беларусі краіна не чужая, таму што там жыве не адзін дзясятак тысяч нашых суайчыннікаў. Лёс гэтых людзей нам неабыякавы. Гэта вядома кожнаму чалавеку ў нас у краіне і гэта ведае кожны, хто калісьці паехаў з тэрыторыі Беларусі ў Ізраіль. Перасяленцы з Беларусі, нашы яўрэі, — гэта людзі асаблівыя. Гэта пяшчотная, маральная нотка нашых адносінаў, якая накладвае адбітак на ўсе нашы адносіны», — сказаў Аляксандр Лукашэнка, звяртаючыся да Авігдора Лібермана.

Аляксандр Лукашэнка асабліва адзначыў, што ў Беларусі ўважліва назіралі за выбарамі ў Ізраілі. «Вы ведаеце нашы адносіны да вас і вашай партыі (Авігдор Ліберман з 1999 года з'яўляецца старшынёй партыі «Наш дом — Ізраіль».), мы балелі за вас, і я вельмі рады, што ўсё склалася так, як вы хацелі», — сказаў Прэзідэнт Беларусі, дадаўшы, што «гэты перыяд у Ізраілі нельга страціць, і неабходна зрабіць максімум па наладжванні адносінаў паміж дзвюма дзяржавамі».

У сваю чаргу Авігдор Ліберман падкрэсліў, што «Ізраіль цэніць уздым у адносінах з Беларуссю» і адзначыў, што настаў час узмацніць эканамічны складальнік супрацоўніцтва дзвюх краін. Ён таксама падзякаваў Беларусі за аднаўленне мемарыяла ў памяць загінулых у Мінскім гета. «Для нас вельмі важна захаваць гістарычную праўду аб Другой сусветнай вайне. Немагчыма пастаянна перапісваць гісторыю або адмаўляць факт Халакоста», — сказаў Авігдор Ліберман.

Тавараабарот паміж Беларуссю і Ізраілем у 2008 годзе склаў $68,2 млн (экспарт — $5,7 млн, імпарт — $62,5 млн). У студзені—красавіку 2009 года тавараабарот склаў $18,5 млн (экспарт — $1,9 млн, імпарт — $16,6 млн).

У Ізраіль пастаўляюцца алмазы, нафтапрадукты, тавары харчовай і лёгкай прамысловасці. Асноўнымі артыкуламі ізраільскага імпарту ў Беларусь з'яўляюцца інсектыцыды і гербіцыды, лекавыя прэпараты, фруктовыя і гароднінныя сокі, фрукты, фарбавальныя рэчывы, медыцынскае абсталяванне, прадукты харчавання, лісты і плёнкі з пластмас і палімераў, вырабы з металакерамікі.

На 2009 год прапрацоўваецца магчымасць правядзення першага пасяджэння сумеснага беларуска-ізраільскага камітэта па гандлёвым і эканамічным супрацоўніцтве. Намецілася тэндэнцыя да павелічэння прытоку ізраільскіх інвестыцый у беларускую эканоміку. У 2008 годзе з Ізраіля паступіла інвестыцый на $11,6 млн, што з'яўляецца найбольшым паказчыкам за ўвесь час двухбаковых адносінаў.

Кампанія Fishman Group вывучае магчымасць удзелу ў рэалізацыі праекта па будаўніцтве інфраструктуры Парку высокіх тэхналогій. Прапрацоўваецца магчымасць прыцягнення інвестыцый кампаніі BSG (будаўніцтва аб'ектаў нерухомай маёмасці), Merhav (рэалізацыя праектаў у галіне сельскай гаспадаркі), IDB (інвестыцыі ў банкаўскі сектар).

НОВЫЯ НАЗНАЧЭННІ

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь 4 чэрвеня разгледзеў кадравыя пытанні.

Кіраўнік дзяржавы назначыў:

Патупчыка Уладзіміра Мікалаевіча — Намеснікам Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь;

Латушку Паўла Паўлавіча — Міністрам культуры;

Міцкевіча Валерыя Вацлававіча — Намеснікам Кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь;

Мацвейчука Уладзіміра Фёдаравіча — памочнікам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь;

Калініна Анатоля Мікалаевіча — памочнікам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь — галоўным інспектарам па г. Мінску;

Асіпенку Вячаслава Аляксандравіча — Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Беларусь у Рэспубліцы Малдова;

Хвастова Міхаіла Міхайлавіча — Пастаянным прадстаўніком Рэспублікі Беларусь пры аддзяленні Арганізацыі Аб'яднаных Нацый і іншых міжнародных арганізацыях у г. Жэневе.

Прэзідэнт даў згоду на назначэнне:

Васіленкі Вячаслава Аляксандравіча — намеснікам Міністра фінансаў;

Мацкевіча Алега Сяргеевіча — намеснікам старшыні Віцебскага аблвыканкама;

Кузняцова Ігара Валер'евіча — старшынёй Міёрскага райвыканкама;

Арлова Мікалая Валер'евіча — кіраўніком адміністрацыі Першамайскага раёна г. Віцебска;

Некрашэвіча Віктара Уладзіміравіча — намеснікам старшыні Магілёўскага аблвыканкама;

Вырко Генадзя Яўгенавіча — старшынёй канцэрна «Беллегпрам»;

Пятрушы Віктара Леанідавіча — дырэктарам Дэпартамента кантролю і нагляду за будаўніцтвам Дзяржаўнага камітэта па стандартызацыі:

Несцярэнкі Уладзіміра Васільевіча — генеральным дырэктарам рэспубліканскага ўнітарнага вытворча-гандлёвага прадпрыемства «Аршанскі льнокамбінат»;

Шаева Валянціна Пятровіча — пракурорам Гомельскай вобласці;

Архіпава Аляксандра Міхайлавіча — пракурорам Мінскай вобласці;

Лаўцель Валянціны Аляксандраўны — дырэктарам адкрытага акцыянернага таварыства «Гранітэкс»;

Башметава Валерыя Сцяпанавіча — членам Віцебскага аблвыканкама;

Прадоўжаны на тры гады тэрмін знаходжання на пасадзе:

намесніка начальніка галоўнага арганізацыйнага ўпраўлення Сакратарыята Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі **Банькоўскага Аляксандра Міхайлавіча;**

намесніка начальніка галоўнага ўпраўлення прававога і дакументацыйнага забеспячэння Сакратарыята Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі **Яршова Аляксея Мікалаевіча.**

Звяртаючыся да кіраўнікоў мясцовых органаў улады, кіраўнік дзяржавы падкрэсліў: «Будзьце вельмі ўважлівымі да людзей, да іх праблем. Свет, як гэта прынята цяпер гаварыць, перажывае сур'ёзны фінансава-эканамічны крызіс. І трэба зрабіць усё, каб на кожным працоўным месцы была адпаведная аддача. Усе павінны разлічваць толькі на сябе, а не чакаць дапамогі збоку».

У размове з Генадзем Вырко, якому належыць узначаліць канцэрн «Беллегпрам», Прэзідэнт адзначыў, што працу галіны неабходна вывесці на больш высокі ўзровень. Для гэтага ёсць неабходныя перадумовы, найперш уласная сыравінная база.

Пры гэтым важна не толькі забяспечыць якаснай прадукцыяй унутранага спажыўца, але і больш актыўна выходзіць на знешнія рынкі.

У размове з пракурорскімі работнікамі Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што сёння існуе шмат пытанняў да працы Пракуратуры. У гэтай сувязі плануецца перагледзець адпаведнае заканадаўства, узмацніць наглядныя функцыі Пракуратуры. Бліжэйшым часам, сказаў Прэзідэнт, таксама адбудзецца нарада па працы МУС.

«Мы правядзём сур'ёзную размову з работнікамі Пракуратуры. Наспеў час на ўзроўні Прэзідэнта прынцыпова абазначыць недахопы працы ў гэтым дзяржоргане, і я хацеў бы, каб усе пачулі мае патрабаванні і да МУС, і да Пракуратуры», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Звяртаючыся да Надзвычайнага і Паўнамоцнага пасла Рэспублікі Беларусь у Малдове Вячаслава Асіпенкі, Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў: «Мы маем намер пашырыць адносіны з Малдовай».

СПАЧУВАННІ ПРЭЗІДЭНТА

У сувязі з катастрофай самалёта кампаніі Air France, у выніку якой загінулі грамадзяне Бразіліі, Германіі, Францыі, Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка выказаў спачуванні кіраўнікам гэтых дзяржаў Луісу Інасіу Луле да Сілва, Хорсту Келеру і Нікаля Сарказі, а таксама родным і блізкім загінулых.

Самалёт А330-200 авіякампаніі Air France, які накіроўваўся з Рыо-дэ-Жанейра ў Парыж, знік з экранаў радараў 1 чэрвеня. На борце аэробуса знаходзіліся 228 чалавек, грамадзяне 32 краін. Найбольшая колькасць ахвяраў — грамадзяне Бразіліі, Германіі і Францыі. Паводле папярэдніх звестак, катастрофа адбылася з-за пападання маланкі ў самалёт, які аказаўся ў зоне турбулентнасці, або з-за непаладак у электраабсталяванні.

Прэс-службa Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

ГАРБАТА З ПРЫСМАКАМ ГАРУ

Прыкладна ў 9 гадзін раніцы ўчора ў інтэрнаце БНТУ па сталічнай вуліцы Якуба Коласа, 26 тры студэнткі вырашылі папіць гарбаты. Адна дзяўчына ўключыла электрычны чайнік і... накіравалася ў другі пакой. Пэўны час на чайнік ніхто не звяртаў увагі, а ён узяў і загарэўся. Агонь для дзвюх астатніх дзяўчат стаў поўнай нечаканасцю і яны з крыкам выбеглі з пакоя...

Магчыма, так пачынаўся пажар у інтэрнаце ў самым цэнтры сталіцы. Прыкладна праз 20—30 хвілін пасля гэтага ўсе студэнты былі эвакуяваныя, а пакой на трэцім паверсе быў патушаны. Сведкі здарэння паведамілі карэспандэнту «Звязды», што пажарныя машыны прыбылі да інтэрната даволі хутка, але ў іх былі праблемы з прыпаркаванымі ўсюды прыватнымі аўтамабілямі, да таго ж, агонь распаўсюджваўся імкліва...

Выконваючы абавязкі начальніка мінскага гарадскога ўпраўлення МНС Руслан ЛІХАМАНАЎ паведаміў:

— Сюды накіравалі больш як 15 падраздзяленняў на аварыйна-выратавальных аўтамашынах. Было моцнае задымленне трэцяга, а таксама чацвёртага і пятага паверхаў. Па ўнутраных лесвіцах было эвакуявана 154 чалавекі, яшчэ 28 студэнтаў пакінулі будынак інтэрната праз аконныя праёмы трэцяга паверха па пажарных лесвіцах. Па медыцынскую дапамогу звярнуліся 4 чалавекі, шпіталізацыя нікому не спатрэбілася.

* * *

У той час, калі пажарныя яшчэ датушвалі згарэлы пакой, недалёка ад спецыяльнага аўтамабіля медыцынскай службы МНС у лёгкім хатнім халаціку стаяла дзяўчынка са слязамі на вачах і непаслухмянымі пальцамі трымала шклянку гарбаты. Студэнтка трэцяга курса машынабудаўнічага факультэта Кацярына Нікалаева жыве ў пакоі 363 і добра ведае дзяўчатак, у якіх адбыўся пажар:

— Мае сяброўкі з 4-га і 5-га курсаў нашага факультэта жылі ў пакоі № 351, а зараз ён цалкам згарэў... Усё адбылося на працягу 2—3 хвілін, а потым гэтае невялікае ўзгаранне ператварылася ў сапраўдны пажар... Спачатку я не збіралася пакідаць будынак інтэрната і заставалася ў сваім пакоі, бо было вельмі страшна. Потым прыйшоў пажарны і выбіў дзверы, бо яны, мабыць, былі зачынены, пасля чаго вывеў мяне з пакоя і прапанаваў спускацца па спецлесвіцы. Я баюся вышыні, таму

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

накіравалася праз калідор. А там у калідоры ўсё было чорнае і шмат дыму. Гэта самае жудаснае, што я бачыла ў сваім жыцці...

* * *

Недзе праз 40 хвілін пасля таго, як было ўсё дасканала праверана, студэнтаў пачалі запускаць у будынак інтэрната.

А ў гэты час пажарныя праз аконны праём згарэлага пакоя выкідвалі з памяшкання рэшткі ложкаў, іншую пагарэлую мэблю і нешта з дзявочага адзення, чорныя падручнікі і сшыткі...

Студэнт 1-га курса ўніверсітэта Андрэй, які жыве на тым жа трэцім паверсе інтэрната, хутчэй за астатніх пачаў усведамляць, што здарылася і чым гэта ім адгукнецца:

— Цікава, а як гэтыя дзяўчаты будуць экзамены здаваць? А жыць яны будуць дзе? А як мы будзем жыць цяпер у гэтых умовах?

Занадта ж вялікі кошт у той гарбаты...

Сяргей КУРКАЧ.

НУ І НУ!

БРАКАНЬЕРАМ З СЕТКАМІ БЫЛА ЖАНЧЫНА — ДЫРЭКТАР ШКОЛЫ

Такога, напэўна, не змогуць прыгадаць нават старажылы рыбаховы: за браканьерства затрымалі дырэктара сярэдняй школы. Кіраўніком навучальнай установы была... жанчына.

Падрабязнасці гэтага здарэння «Звяздзе» паведаміў дзяржінспектар Аршанскай міжрайінспекцыі Алег Бахцін, які прымаў удзел у прыродаахоўным рэйдзе.

— Увечары ў 23.50 на водасховішчы, што размешчана на рацэ Іржэўка ў Талачынскім раёне, мы заўважылі плот на вадзе. На ім быў адзін чалавек, які даставаў з сетак рыбу. Потым высветлілася, што гэта жанчына. На той момант мы яшчэ не ведалі, кім яна працуе, але ўжо адно гэта моцна здзівіла — слабы пол ноччу ловіць рыбу сеткамі. На наша пытанне, чаму яна так зрабіла, адказала, што ёй падабаецца лавіць рыбу, — расказаў Алег Мікалаевіч.

У педагагічнага работніка 1957 года нараджэння канфіскаваныя дзве сеткі агульнай даўжынёй 50 метраў і 12 карасёў. Трэба дадаць, што ўсё гэта адбылося, калі яшчэ дзейнічала забарона на лоўлю рыбы падчас яе веснавога нерасту. На дырэктара сярэдняй школы за парушэнне Правілаў вядзення рыбалоўнай гаспадаркі і рыбалоўства складзены адміністрацыйны пратакол, які перададзены для разгляду ў суд Талачынскага раёна. Што тут яшчэ можна дадаць?..

Хіба толькі яшчэ адну гісторыю, як кажуць, па «школьнай тэме». На возеры Дварэцкае Глыбоцкага раёна дзяржінспектары затрымалі грамадзяніна, які разам з няпоўнагадовымі навучэнцамі 7 класа сярэдняй школы падчас дзеяння забароны на лоўлю рыбы і вузкапалага рака здабывалі іх брэднем. Налавіць паспелі 10 рыбін і 28 ракаў, чым нанеслі прыродным рэсурсам урон у буйным памеры. Глыбоцкі РАУС разглядае пытанне аб узбуджэнні крымінальнай справы.

P.S. *Дакладныя каардынаты школ у абодвух выпадках мы вырашылі не называць. Ці, магчыма, чытачы маюць іншае меркаванне? У тым сэнсе, што, можа, браканьерства стане менш, калі парушальнікі не толькі матэрыяльна будуць кампенсаваць нанесены прыродзе ўрон, несці крымінальную адказнасць, але яшчэ і будуць ведаць: за свае супрацьпраўныя дзеянні можна абняславіць уласнае прозвішча і сваю сям'ю на ўсю краіну?..*

Сяргей РАСОЛЬКА.

КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ» ПО ПОРУЧЕНИЮ ЛИКВИДАЦИОННОЙ КОМИССИИ

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже имущества КУП «Ландыш»: **Лот № 1:** склад для топлива, об. пл. 68,6 кв.м, производственный цех, об. пл. 272,6 кв.м, котел КСИ-0,09Т, забор чугунный, туалет кирпичный, *Слуцкий р-н, д. Греск, ул. Минская, 1.* Начальная цена с НДС (снижена на 10 %) – 56 480 895 бел. руб. Задаток – 10 % от начальной цены. **Лот № 2:** здание цеха, об. пл. 3406,5 кв.м, ограждение (кирпичное; ж/б), таль электрическая ТЭ-050, котел КСТ-25, котел КСВ-0,09Т, *г. Слуцк, ул. М. Богдановича, д. 57а.* Начальная цена с НДС (снижена на 20 %) – 663 389 814 бел. рублей. Задаток 30 000 000 бел. руб. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 25.04.2009 г. Аукцион состоится **30.06.2009 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **29.06.2009 г.** до 17.00 по указанному адресу.

Тел (8017) 224 61 34. Сайт в интернете: www.rlt.by.

УНП 690324015

ОАО «МИНСКЛИФТ»,

находящееся по адресу: Республика Беларусь, 220033, г. Минск, Велосипедный переулок, д. 5 (кабинеты №№ 3, 4, 11, расположенные на 4-м этаже помещения № 3 административного помещения),

ИЗВЕЩАЕТ О СОЗЫВЕ ПЕРВОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ

Собрание состоится 9 июля 2009 г. по адресу: г. Минск, 1-й Велосипедный пер., 5, 4-й этаж, актовый зал. Регистрация участников собрания с 12.45 до 13.45. Начало работы собрания в 14.00.

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. Информация об итогах льготной продажи и обмена на ИПЧ «Имущество» работникам Общества акций, принадлежащих государству.
2. Отчет о результатах деятельности Общества за период с 9 декабря 2008 г. по 30 апреля 2009 г.
3. Утверждение направлений использования нераспределенной прибыли, остающейся в распоряжении предприятия за 2009 год и первый квартал 2010 г.
4. Избрание членов Наблюдательного совета.
5. Избрание членов Ревизионной комиссии.
6. Утверждение условий материального вознаграждения членам Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии.
7. Определение органа печати, в котором будут публиковаться годовые отчеты Общества, решения о созыве собрания акционеров и др.

Акционер ОАО «Минсклифт» принимает участие в работе собрания лично или через своего представителя, действующего на основании доверенности.

Для регистрации на собрании необходимо при себе иметь паспорт и доверенность.

С материалами собрания акционеры могут ознакомиться по месту нахождения Общества.

УНП 190292990.

БЕЛАРУСЬ СПАДЗЯЕЦЦА АТРЫМАЦЬ ПРАВА НА ЭКСПАРТ МАЛОЧНАЙ І РЫБНАЙ ПРАДУКЦЫІ Ў ЕЎРАСАЮЗ

У Беларускім аграпрамысловым тыдні сёлета ўдзельнічаюць эксперты з 18 краін свету. Гэта выдатная магчымасць умацаваць старыя кантакты, знайсці новыя рынкі збыту айчыннай прадукцыі.

Беларускі карп паляцеў у Галандыю

Аматараў рыбы я знайшла ў так званай «рыбнай вёсцы». Наведвальнікі-дылетанты глядзелі на рыбу ў басейне круглымі ад здзіўлення вачыма.

— Мы і не думалі, што ў Беларусі водзіцца такая экзатычная рыба.

Найбольшую ўвагу прыцягвае самая маленькая рыбка.

— Гэта весланос, — тлумачыць **намеснік дырэктара па рэалізацыі і збыту рыбгаса «Сялец» Бярозаўскага раёна Сяргей СЕЛЬМАШУК.** — Летась завезлі яго з Астрахані па рэспубліканскай праграме. Праз 10 гадоў ён будзе здольны да размнажэння. У будучыні планаем распаўсюдзіць гэты від рыбы па ўсёй рэспубліцы.

Да Сяргея Аляксандравіча падыходзяць людзі, цікавяцца платнай рыбалкай, рыбапасадачным матэрыялам, пытаюцца, як адчувае сябе прадпрыемства падчас сусветнага фінансава-эканамічнага крызісу.

Так і хочацца адказаць «як рыба ў вадзе», але ўсё насамрэч не так добра, як хацелася б.

— Сёлета, на жаль, увесь восеньска-зімовы перыяд не маглі прабіцца на расійскі рынак з-за цэнаў. Прычына ў тым, што летась быў вельмі дарагі корм для рыбаў (у межах 1 мільёна за тону), таму кошт адборнага карпа павысіўся да 6,5 тысячы рублёў за кілаграм. Акрамя таго, перашкодай для экспарту нашай рыбы ў Расію стала пастанова аб абавязковым інспектаванні расійскай ветэрынарнай камісіі. Мы ў гэтым рэестры пакуль не значымся, бо ліквідуем дробныя заўвагі, якія зрабіла нам беларуская ветэрынарная служба.

Паводле слоў майго суразмоўцы, ёсць праблемы з рэалізацыяй карпа і ў Беларусі. Гэта звязана з тым, што ўсе рыбгасы апошнім часам моцна нарасцілі аб'ёмы вытворчасці, а людзі не сталі яго больш есці. Узнікла аб'ектыўная праблема продажу. Таму прадпрыемствы вымушаны шукаць рынкі збыту за мяжой.

— У сувязі з гэтым ёсць прыемная навіна. У аўторак на выставе быў галандскі пасол. Мы з ім дамовіліся, што ў чацвер два герметычныя кантэйнеры з карпам паляцяць у галандскую лабараторыю, якая правядзе аналізы нашай рыбы і выдасць сертыфікат якасці. З ім мы будзем мець магчымасць выхаду на ўсе рынкі краін Еўрасаюза.

Калі пацякуць «малочныя рэкі» ў Еўрасаюз?

Беларускія прадпрыемствы таксама спадзяюцца атрымаць права на экспарт малочнай прадукцыі ў Еўрасаюз. Пра гэта паведаміла **намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення знешнеэканамічнай дзейнасці Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Тамара УСАЧОВА.**

— Мы разлічваем, што гэта будзе ўжо сёлета. Ужо пройдзены першы этап: праведзена праверка трох прадпрыемстваў — «Савушкін прадукт», «Бярозаўскі сыраробны камбінат» і падраздзялення па вырабе марожанага «Санта-Брэмар» (на падставе праверкі асобных прадпрыемстваў робіцца заключэнне па прадастаўленні права на экспарт малочнай прадукцыі для ўсёй краіны. Ужо потым беларуская ветэрынарная служба будзе вызначаць, хто з прадпрыемстваў адпавядае патрабаванням Еўрасаюза і каму трэба даць права на вываз прадукцыі).

(Заканчэнне на 5-й стар.)

Фота Марыны БЕЛУНКОВАЙ.

КОШТ ВАЛЮТНАГА КОШЫКА ПЕРАВЫСІЎ BR1000

Сёлета, пасля прывязкі нацыянальнай валюты да кошыка з трох валют, упершыню яго кошт перавысіў 1000 рублёў і вызначаны на сёння на ўзроўні 1000,39 рублёў.

На ўчарашніх таргах Беларускай валютна-фондавай біржы курс беларускага рубля да долара ЗША аслабіўся на 16 рублёў і склаўся на ўзроўні 2791 рубель за долар, курс еўра ўзрос на 8 рублёў і дасягнуў 3968 рублёў, да расійскага рубля наша нацыянальная валюта ўмацавалася на 0,55 рубля — 90,39 за адзін расійскі рубель. Такім чынам, курс беларускага рубля да кошыку валют з пачатку года знізіўся на 4,21 працэнта і знаходзіцца ў пяціпрацэнтным калідоры хістання (сёлета хістанні кошту кошыка дапускаюцца ў межах ад 912 да 1008 рублёў).

Пасля аднаразовай дэвальвацыі беларускага рубля яго курс да долара ЗША знізіўся на 5,32 працэнта, да еўра — на 7,17 працэнта, да расійскага рубля — на 0,26 працэнта.

Ігар ГРЫШЫН.

ПО ПОРУЧЕНИЮ ОАО «БЕЛПРОМТАРА» ЗАО «ЦЕНТРАЛЬНОЕ БЮРО ОЦЕНКИ» ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН ПО ПРОДАЖЕ СЛЕДУЮЩИХ ОБЪЕКТОВ:

№ лота	Местоположение объектов, площадь земельного участка	Состав объектов*, площадь	Начальная цена с НДС, бел. руб.	Сумма задатка, бел. руб.
1	Минская обл., г. Молодечно, ул. Либаво-Роменская, 54, S=2,8029 га	**Административное здание** – 278,8 м²; гараж – 271,8 м²; **мехмастерская** – 47,1 м²; **лесопильный цех** – 481,7 м²; **цех новой тары** – 476,4 м²; **цех тары** – 597,7 м²; **котельная с сушилкой** – 170 м²; **склад хранения тары** – 993 м²; **склад хранения тары** – 655,9 м²; **асфальтовое покрытие** – 6199,84 м²; **бетонное покрытие –** 2520 м²	1 720 909 640	172 000 000
2	Минская обл., г. Вилейка, ул. Шубина, 41, S=1,0695 га	**Навес хранения тары** – 517,3 м²; **ленкомната** – 8 м²; **контора с пристройкой** – 104,6 м²; **цех ремонта карт. тары** – 321 м²; **цех тарный+сарай** – 57,3 м²; **цех новой тары+сарай** – 252,5 м²; **склад хранения тары** – 610 м²; **гараж с пристройкой** – 149,4 м²; **сарай (к цеху ремонта карт. тары)** – 89 м²; **асфальтовое покрытие** – 1707 м²	662 593 600	66 000 000
3	Минская обл., г. Сморгонь, ул. Железнодорожная, 7, S=0,9336 га	**Административное здание** – 82 м²; **навес для хранения тары** – 412,6 м²; **склад прочей тары** – 973,4 м²; **склад 1** – 99,6 м²; **склад 2** – 98,6 м²	427 521 080	42 000 000
4	Гродненская обл., г. Слоним, ул. Железнодорожная, 3, S=0,5614 га	**Контора** – 54,1 м²; **производственный цех** – 1220,9 м²	247 257 436	24 000 000

*** - с полным перечнем объектов можно ознакомиться у организатора аукциона.**

1. Аукцион состоится **06 июля 2009 года в 12.00** по адресу: г. Минск, пр. Независимости, 11.

2. Заявления и документы на участие принимаются в рабочие дни **с 9.00 до 17.30** по адресу: г. Минск, пр. Независимости, 11/2-318, тел. 200 27 57 (58), факс 209 93 79, E-mail: cbo@tut.by. Последний день приема заявлений и документов **01.07.2009 г. до 17.00.**

3. Сумма задатка перечисляется на расчетный счет № 3012063240017 в ф-ле ЦБУ № 5 ЗАО «МТБанк», г. Минск, пр. Независимости, 11/2, код 117. Получатель ЗАО «Центральное бюро оценки», УНП 190863966.

4. Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в следующем порядке: 100 % стоимости объекта оплачивается в течение 20 дней с даты подписания договора купли-продажи. Порядок проведения аукциона и подробный перечень имущества оговорен в условиях его проведения.

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 4.06.2009 г. (для б/н разлікаў)

▲ 1 долар ЗША	2 791,00
▲ 1 еўра	3 968,52
1 латвійскі лат	5 600,48
1 літоўскі літ	1 150,52
1 чэшская крона	147,76
1 польскі злоты	879,93
▼ 1 расійскі рубель	90,39
1 украінская грыўня	366,56

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў

Цэнтрабанк РФ

USD	30,8767
10 UAH	40,5206
1000 BYR	11,1227
EUR	43,8542

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2009 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009

Першы будынак адміністрацыйна-вытворчага комплексу ПВТ уведзены ў эксплуатацыю

Як паведаміў БЕЛТА на прэзентацыі корпуса **дырэктар адміністрацыі ПВТ Валерый ЦАПКАЛА,** гэта самы буйны офісна-вытворчы будынак у Беларусі, плошча складае амаль 23 тыс. кв.м. «Асаблівасць гэтага будынка ў параўнанні з іншымі буйнымі аб'ектамі ў краіне ў тым, што ён уведзены ў асноўным за кошт замежных інвестыцый, — сказаў Валерый Цапкала. У ПВТ сёння працуюць больш як 6 тыс. інжынераў-праграмістаў. Тры гады таму, калі ПВТ пачаў функцыянаваць, экспарт праграмнага забеспячэння Беларусі складаў амаль $12 млн. За тры гады ён вырас у 10 разоў. Сёння ПВТ актыўна вядзе работу па прыцягненні ў Беларусь новых буйных інвестараў. «У прыватнасці, ідуць перагаворы з амерыканскай кампаніяй «Ханіўэл», вытворцам турбін для авіяцыі, а таксама кампаніяй «Бош» аб адкрыцці інжынірынгавых цэнтраў у Мінску».

Абзац

◢ **Паводле звестак на 1 студзеня гэтага года, у Беларусі 223 тыс. чалавек знаходзіліся ў водпуску па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў. Сярод атрымальнікаў гэтага віду дапамогі пераважаюць маці дзяцей (іх 220,8 тыс.). Акрамя таго, у водпуску па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў знаходзяцца 2 тыс. 126 бацькаў, а таксама 165 бабуль і 8 дзядуль.**

◢ Тры службовыя асобы з Лоеўскага раёна, у тым ліку адзін з кіруючых работнікаў райвыканкама, затрыманыя па падазрэнні ва злоўжыванні ўладай. Аб гэтым паведамілі ў Гомельскім абласным упраўленні па барацьбе з арганізаванай злачыннасцю. Летась адзін з кіруючых работнікаў Лоеўскага райвыканкама насуперак інтарэсам службы ў змове са службовымі асобамі раённага УКГ падпісалі загадзя фіктыўны акт прыёмнай камісіі па прыёме ў эксплуатацыю трох аднакватэрных дамоў, будаўніцтва якіх не завершана. Пры гэтым аб'ёмы выкананых работ, паказаныя ў дакументах, былі завышаныя. Службовыя асобы прычынілі шкоду КСУП «Ураджайны», на тэрыторыі якога ўзводзіліся дамы, на суму каля Br40 млн.

◢ **Суд Касцюковіцкага раёна прыгаварыў былога старшыню праўлення Касцюковіцкага райпа Аляксандра Кірыенку да васьмі гадоў пазбаўлення волі з канфіскацыяй маёмасці па фактах злоўжывання службовым становішчам, атрымання хабару і махляр-ства. Аб гэтым паведамілі ў прэс-службе пракуратуры вобласці. Кіраўнік спажывецкага таварыства вырашыў падзарабіць на продажы складскіх памяшканняў былой міжрайбазы (размешчанай на чыгуначнай станцыі «Камунары») адной з камерцыйных фірмаў — за Br20 млн. Работнік гандлю прызначыў сустрэчу для перада-чы грошай у лясным масіве недалёка ад аўтадарогі Касцюковічы—Клімавічы, дзе ён і быў злоўлены на месцы злачынства супрацоўнікамі праваахоўных органаў.**

Поўны абзац

◢ Жудасная трагедыя адбылася ў Кіеве: нямецкая аўчарка да смерці загрызла васьмігадовую дзяўчынку. Прычым за апошні год гэта ўжо другі напад сабакі па мянушцы Майк на дзіця — першы раз ён накінуўся на хлопчыка і адкусіў яму вуха. Гэтым разам усё скончылася смерцю Дарыны Лаўровай — сабака перагрыз ёй горла. Нягледзячы на гэта, гаспадары адмаўляюцца ўсыпляць сабаку-забойцу.

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

Адпачываць? Зважай на... зніжкі

У параўнанні з мінулым годам агульная ўмяшчальнасць прафсаюзных санаторыяў узрасце з 4,7 да 5 тысяч чалавек у заезд.

Адначасова, як паведаміў генеральны дырэктар санаторна-курортнага прадпрыемства «Белпрафсаюзкурорт» Анатоль Васкевіч, зменіцца сама якасць аздараўлення. Прафсаюзныя здраўніцы паступова адмаўляюцца ад нумароў на 3-4 і павялічваюць колькасць нумароў на 1-2 месцы. Зноў-такі ад ступені камфорту будзе залежаць і цана. Кошт сутак адпачынку сёлета вагаецца ад 32-35 да 120-150 тысяч рублёў з улікам пражывання, медыцынскіх паслуг, а таксама як мінімум 3-разовага харчавання для дарослых і 5-разовага — для дзяцей.

Пры гэтым, каб зрабіць адпачынак больш даступным, кожны зможа вызначаць яго працягласць самастойна. Плюс да таго, для членаў прафсаюзаў, што наведваюць любую з 12 прафсаюзных здраўніц за поўны кошт, прадугледжваецца 15-працэнтная зніжка па аплаце пуцёўкі.

Ці не найбольш вострая тэма апошняга часу — дэфіцыт «дарослых» пуцёвак. Паводле слоў Анатоля Васкевіча, пакуль свабодныя месцы на чэрвень ёсць. Не будзе пытанняў і восенню, больш за тое, не выключаецца варыянт, што ў вересні прафсаюзныя здраўніцы прапануюць дадатковыя зніжкі. А вось з ліпенем-жніўнем сапраўды могуць узнікнуць праблемы. Зрэшты, у гэтым выпадку існуе альтэрнатыўны варыянт так званых баз адпачынку, дзе прапануецца пражыванне і харчаванне без лячэння.

У «высокі сезон» прафсаюзныя базы адпачынку могуць наведваць адначасова каля 2 тысяч чалавек. Як і ў санаторыях, кошт вызначае ўзровень камфорту. У прыватнасці, пуцёўка на 1 дзень можа вагацца ў межах 20-80 тысяч, на 3 дні — у межах 80-300 тысяч, на 12 дзён — 300 тысяч — 1 мільёна рублёў. Да 15 чэрвеня і з 20 жніўня тут прадугледжваюцца зніжкі. Апроч таго, існуюць зніжкі ў залежнасці ад колькасці паслуг і дзён адпачынку: для груп — 2-9 %, для ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны і інвалідаў — 3-20 %, для дзяцей — 10-20 %.

Дарэчы, як паведаміла загадчык сектара галоўнага ўпраўлення па грамадскай рабоце ФПБ Любоў Красаценка, сёлета будуць працаваць 23 прафсаюзныя загарадныя летнікі, у якіх зможа адпачыць 12,5 тыс. дзяцей. Пры гэтым сама колькасць летнікаў не зменшыцца. Што да кошту пуцёвак, то ў сярэднім ён складзе 460 тысяч рублёў, 255 тысяч з якіх кампенсуецца дзяржаўнай датацыяй. Мінімальны паказчык бацькоўскай аплаты складзе 10 %. А вось ці будзе ён большым, залежыць перш-наперш ад таго, ці змогуць выдзеліць дадатковую дапамогу на дзіцячы адпачынак арганізацыі і прафкамы. У той жа час Любоў Красаценка паведаміла: сёлета Федэрацыя прафсаюзаў Беларусі выдаткуе не менш за 100 мільёнаў рублёў на зніжэнне кошту пуцёвак для дзяцей са шматдзетных сем'яў і сем'яў з нізкім узроўнем даходаў.

Сяргей ГРЫБ.

ПАЛІВА НА ХАЛЯВУ?

А чаму не? Так, відаць, вырашылі двое маладых мазыран. І наладзілі адкачку каштоўнай вадкасці з нафтаправода.

Змайстравалі самаробны механізм для адпампоўвання нафты, каля населенага пункта Міхайлаўская Рудня ў Мазырскім раёне зрабілі несанкцыянаваную ўрэзку ў нафта-правод. Ад месца, дзе нафта ішла «налева», праклалі трубу даўжынёй 130 метраў, якая заканчвалася ёмістасцю на тысячу літраў. Усё замаскіравалі. Пакуль гэтае месца не знайшлі супрацоўнікі мабільных груп службы аховы прадпрыемства «Захад-транснафтапрадукт». Тут іх і затрымалі.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

г. ВИТЕБСК **08 июля 2009 г.**

ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ НА ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ
ОРГАНИЗАТОР АУКЦИОНА – ФОНД «ВИТЕБСКОБЛИМУЩЕСТВО»

№ лота	Месторасположение земельного участка, адрес, кадастровый номер участка, арендодатель	Характеристика расположенных на участке строений, инженерных коммуникаций	Площадь земельного участка, га	Срок аренды, лет	Назначение участка	Условия продажи	Начальная цена объекта, руб., дол. США	Сумма задатка, руб.
1.	Земельный участок расположен по адресу: Витебская область, Глубокский район, 135 км автодороги Р-3 Логойск – Зембин – Глубокое – граница Латвийской Республики (Урбаны), кадастровый номер 221500000010000117 Арендодатель – Глубокский районный исполнительный комитет	Древесно-кустарниковая растительность – 0,8292 га	0,8292	40	Для строительства и обслуживания пункта питания	- возмещение победителем аукциона расходов, связанных с проведением аукциона и подготовкой документации, необходимой для его проведения; - заключение победителем аукциона с Глубокским райисполкомом договора аренды земельного участка и осуществление в двухмесячный срок после принятия решения райисполкома о предоставлении ему земельного участка государственной регистрации права на земельный участок; - получение победителем аукциона в установленном порядке разрешения на проведение проектно-изыскательских работ и разработки проекта на строительство объекта в срок, не превышающий двух лет; - в течение шести месяцев со дня получения свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации возникновения права на предоставляемый земельный участок приступить к занятию данного участка; - осуществление строительства объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией.	330 742 руб.	33 074 руб.
2.	Земельный участок расположен по адресу: Витебская обл., Шарковщинский р-н, Воложинский с/с, вблизи д. Воложинки, кадастровый номер 225580800001000001 Арендодатель – Шарковщинский районный исполнительный комитет	Пахотные земли. Ограничение в использовании земельного участка в связи с его расположением в водоохранных зонах водных объектов вне прибрежных зон (река Густатка).	0,2216	25	Под строительство объекта «Пункт питания Р-3 174 (лево)»	- снятие, сохранение и использование плодородного слоя почвы предусмотреть проектно-сметной документацией; - заключение победителем аукциона с Шарковщинским райисполкомом договора аренды земельного участка и осуществление в двухмесячный срок после принятия решения райисполкома о предоставлении земельного участка государственной регистрации права на земельный участок; - получение победителем аукциона в установленном порядке разрешения на проведение проектно-изыскательских работ и разработки строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий 2 года, - осуществление строительства объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией.	53 470 руб.	5 347 руб.
3.	Земельный участок расположен по адресу: Витебская область, Толочинский район, Кохановский поселковый Совет, д. Сальники, ул. Проселочная, 2б, кадастровый номер 224675619601000007 Арендодатель – Толочинский райисполком	Неиспользуемые земли	0,3898	20	Для строительства и обслуживания кемпинга	- заключение победителем аукциона с Кохановским поселковым исполнительным комитетом договора аренды земельного участка; - осуществление победителем в двухмесячный срок после принятия решения райисполкома о передаче ему земельного участка в аренду государственной регистрации права на земельный участок; - получение победителем аукциона в установленном порядке разрешения на проведение проектно-изыскательских работ и разработки строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий два года; - осуществление строительства объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией.	44 250 руб.	4 425 руб.
4.	Земельный участок расположен по адресу: Витебская область, Толочинский район, 543 км (лево) автомагистрали М1/Е30 Брест (Козловичи) – Минск – граница РФ вблизи д. Малое Высокое Кохановского поссовета, кадастровый номер 224600000001000676 Арендодатель – Витебский облисполком	Ограничение в использовании земельного участка в связи с его расположением в охранной зоне линии связи	0,0980	99	Для строительства и обслуживания мини-кафе	- победителю аукциона в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона оплатить в установленном порядке убытки и упущенную выгоду сельскохозяйственному производственному кооперативу «Звенячи» в сумме 125,230 тыс. рублей, связанные с изъятием сельскохозяйственных земель, согласно отчету; - не позднее двух рабочих дней после внесения денежных выплат и выполнения условий, указанных в протоколе аукциона, заключить с Толочинским райисполкомом, действующим от имени облисполкома, договор аренды земельного участка; - осуществить государственную регистрацию права на земельный участок в двухмесячный срок со дня предоставления этого участка; - получить в установленном порядке разрешение Толочинского райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработать проект на строительство объекта в срок, не превышающий двух лет; - в течение шести месяцев с момента утверждения в установленном порядке проектно-сметной документации на строительство объекта приступить к занятию данного участка; - произвести перенос капитального строения РУП «Минскавтодор-Центр», расположенного на земельном участке, в соответствии с проектно-сметной документацией; - снять плодородный слой почвы и использовать его в соответствии с разработанной проектно-сметной документацией; - осуществить строительство объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией.	16 574 руб.	1 657 руб.
5.	Земельный участок расположен по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, км. 150 (право) автомобильной дороги М8/Е95 граница РФ (Езерище) – Витебск – Гомель – граница Украины (Новая Гута) южнее деревни Высокое Высоковского сельсовета, кадастровый номер 223600000001002089 Арендодатель – Оршанский районный исполнительный комитет	Пахотные земли 1,8625 га – сельскохозяйственного производственного кооператива «Маяк Коммуны», 0,7271 га – земли ООО «Орадс-Универсал». Ограничение в использовании земельного участка в связи с его расположением в охранной зоне линии электропередачи напряжением до 1000В, пл. 0,0400 га.	2,5896	50	Под размещение пункта постоя, станции технического обслуживания, охраняемой стоянки и пункта питания	- оплатить в установленном порядке упущенную выгоду сельскохозяйственному производственному кооперативу «Маяк Коммуны» в сумме 3534,904 тыс. рублей, связанную с изъятием сельскохозяйственных земель, согласно отчету; - получение в установленном порядке разрешение Оршанского райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработка проекта на строительство пункта постоя, станции технического обслуживания, охраняемой стоянки и пункта питания в срок, не превышающий двух лет; - в течение шести месяцев со дня получения свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации возникновения права на земельный участок приступить к занятию данного участка; - снятие на занимаемом земельном участке плодородного слоя почвы и использование его в соответствии с проектно-сметной документацией; - осуществление строительства объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией.	1765,37 дол. США	489 787 руб.
6.	Земельный участок расположен по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, Высоковский с/с, южнее деревни Высокое 67 км (лево) автомобильной дороги Р-87 Витебск Орша, кадастровый номер 223600000001002082 Арендодатель – Оршанский районный исполнительный комитет	Луговые естественные земли 4,4342 га – сельскохозяйственного производственного кооператива «Маяк Коммуны»	4,4342	50	Под размещение пункта постоя и охраняемой стоянки	- в течение шести месяцев со дня получения свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации возникновения права на земельный участок приступить к занятию данного участка; - оплатить в установленном порядке упущенную выгоду сельскохозяйственному производственному кооперативу «Маяк Коммуны» в сумме 842,453 тыс. рублей, связанную с изъятием сельскохозяйственных земель, согласно отчету; - получение в установленном порядке разрешения Оршанского райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработка проекта на строительство пункта постоя и охраняемой стоянки в срок, не превышающий двух лет; - снятие на занимаемом земельном участке плодородного слоя почвы и использование его в соответствии с проектно-сметной документацией; - осуществление строительства объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией	3022,86 дол. США	838 605 руб.

1. Аукцион состоится 08 июля 2009 г. в 15 часов в здании фонда «Витебскоблимущество» по адресу: г. Витебск, ул. Правды, 38.

2. Для участия в аукционе приглашаются индивидуальные предприниматели и юридические лица. Участнику необходимо подать заявление в фонд «Витебскоблимущество».

Лица, желающие принять участие в аукционе, к заявлению прилагают: заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка, а также представляются: юридическими лицами (резиденты РБ) – доверенность, выданная представителю юридического лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица; индивидуальными предпринимателями – копия свидетельства о государственной регистрации без нотариального засвидетельствования; представителям индивидуальных предпринимателей – нотариально удостоверенная доверенность; юридическими лицами (нерезиденты РБ) – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык; представитель иностранного юридического лица дополнительно представляет легализированную в установленном порядке доверенность. При подаче документов на участие в аукционе уполномоченные лица предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

3. Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 8.00 до 17.00, последний день приема документов 01 июля 2009 г. до 16.00 по адресу: г. Витебск, ул. Правды, 38, кабинет 308. Заключительная регистрация участников 08 июля 2009 г. с 14.00 до 14.45. К участию в торгах не допускаются участники, не прошедшие заключительную регистрацию.

4. Сумма задатка перечисляется на расчетный счет № 3642903000021, в филиале ОАО «БПС-Банк» по Витебской области г. Витебск, код 150801307. Получатель – фонд «Витебскоблимущество», УНП 300002495.

5. Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов на право заключения договоров аренды земельных участков, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Аукцион признается несостоявшимся, если заявление на участие подано менее чем двумя участниками, предмет аукциона не может быть продан по начальной цене.

6. Участник, ставший победителем аукциона, после окончания аукциона обязан: подписать протокол аукциона в день проведения аукциона; **не позднее 10 дней** после вступления в силу решения о предоставлении земельного участка возместить расходы по формированию и регистрации земельного участка и затраты на подготовку и проведение аукциона в сумме 3 миллиона рублей (по каждому лоту); внести плату за право заключения договора аренды земельного участка в долларах США или белорусских рублях по курсу Национального Банка Республики Беларусь на дату платежа; **не позднее 12 дней** после вступления в силу решения о предоставлении земельного участка заключить с арендодателем договор аренды земельного участка.

7. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с объектами продажи.

8. Контактный телефон в Витебске: (0212) 476096, сайты: www.fondgosim.vitebsk.by, www.gki.gov.by, E-mail:votfondgi@tut.by.

КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ»

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

Такім чынам грамадскасць хоча паўплываць на палітыкаў, якія будуць прымаць канчатковае рашэнне па гэтым пытанні. Ёсць надзея, што такая акцыя дапаможа прадухіліць небяспечнае змяненне клімату, якое з кожным годам набірае моц. Асаблівая надзея на тое, што краіны з дапамогай гэтай акцыі ў найбліжэйшы час знізяць выкіды парніковых газаў, якія непакояць усіх эколагаў.

Прыемна, што Беларусь бярэ ўдзел у такой незвычайнай акцыі. Такая прапанова ўспрымаецца насельніцтвам з энтузіязмам. Нягледзячы на тое, што пасля давядзецца мыць рукі, людзі ахвотна згаджаюцца паўдзельнічаць. Прычым не толькі моладзь, але і сталыя людзі. На руцэ беларусы пішуць абсалютна розныя адказы: ад агульных прыродных каштоўнасцяў кшталту «лес», «зямля», «паветра» да асабістых. Варта адзначыць, што ўсе ўдзельнікі ставяцца да выбару слова, якое збіраюцца напісаць, з адказнасцю: разважаюць, узважваюць, што ж нам больш патрэбна. Хапае і арыгінальных адказаў. Адзін мужчына, напрыклад, старанна напісаў «цешча». Моладзь часцей за іншых не піша слова, а малюе гэтае паняцце. Ужо сабрана шмат фотаздымкаў з малюнкамі зялёных сонейкаў, кропелек ды сняжынак.

Далучайцеся і іншыя! Я сама паўдзельнічала ў такой акцыі. І калі малявала сваё слова на руцэ, насамрэч адчувала адказнасць за напісанае.

Спадзяёмся, што палітыкі і эколагі паглядзяць на твары тысяч беларусаў на міжнародным постары і наш народ таксама дапаможа памяркаваць чалавека і прыроду і спыніць глабальнае пацяпленне. А пакуль акцыя працягваецца.

Вікторыя ЦЕРАШОНАК.

Конкурс у Ліцэй БДУ — 4 чалавекі на месца

У Ліцэі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта падведзены вынікі ўступнай кампаніі. Прыёмныя іспыты праходзілі 10, 17 і 24 мая.

На 240 месцаў пры паступленні ў дзясятыя класы прэтэндавалі 1004 чалавекі, такім чынам конкурс склаў каля 4 чалавек на месца. Самым папулярным у абітурыентаў стаў філалагічны напрамак, дзе на 40 месцаў прэтэндавалі 193 чалавекі (конкурс 4,8 чалавека на месца). Далей у спісе па папулярнасці ідзе гістарычны напрамак — 122 чалавекі на 40 месцаў (конкурс 3,5), фізіка-матэматычны — 289 на 100 месцаў (конкурс 2,89) і хіміка-біялагічны — 148 на 60 месцаў (конкурс 2,46). Пасля здачы двух іспытаў прахадны бал склаў 106 — на хіміка-біялагічным, 111 — на філалагічным, 102 — на фізіка-матэматычным і 86 — на гістарычным (з 200 магчымых).

У 11-х штрых-класах на 240 месцаў прэтэндаваў 841 чалавек. Прахадны бал склаў 99. Калі будучыя дзесяцікласнікі здавалі два ўступныя іспыты, то ў гэтым выпадку абітурыентам трэба было прайсці агульнаадукацыйны тэст, які ўключаў пытанні па 8 школьных прадметах. Такім чынам, у роўнай ступені маглі праявіць сябе і «фізікі», і «філолагі». У агульны залік браліся лепшыя вынікі па чатырох прадметах. Акрамя тых, хто паспяхова прайшоў уступную кампанію, да залічэння у Ліцэй без здачы уступных выпрабаванняў былі рэкамендаваныя 33 пераможцы рэспубліканскіх алімпіяд (6 чалавек — у 10-я класы і 27 чалавек — у 11 штрых-класы).

Надзея НІКАЛАЕВА.

Аляксандр Глеб:

«Калі федэрацыя арганізуе, прывязу Кубак Лігі чэмпіёнаў у Мінск»

З чэрвеня на сталічным стадыёне «Дынама» прайшла адкрытая трэніроўка нацыянальнай зборнай па футболе. А папярэднічала ёй сустрэча з балельшчыкамі, якія апошнім часам сталі традыцыйнымі. Аматары футбола, якіх на стадыёне сабралася некалькі соцень, мелі магчымасць падысці да гульцоў па аўтограф і сфатаграфавацца. Футбалісты размясціліся за столікамі прама на бегавой дарожцы стадыёна. І калі першая такая акцыя, якая праходзіла год таму, у арганізацыйным плане мела шэраг недахопаў (балельшчыкі натоўпам рынуліся да сталоў футбалістаў і ў штурханіне імкнуліся атрымаць аўтограф), то цяпер міліцыя прапускала да гульцоў невялікія групы фанатаў, і ў кожнага была магчымасць сфатаграфавацца і паразмаўляць са сваімі кумірамі. Праўда, каб трапіць на стадыён, трэба было як і перад матчам прайсці так званы «паверхневы агляд» — тыя ж рамкі і металашукальнікі, што многіх балельшчыкаў толькі раздражняла: мы на гульцоў прыйшлі паглядзець, да чаго ўсё гэта?

Сустрэча праходзіла пад канферанс нязменнага дыктара стадыёна «Дынама» Леаніда Бандаровіча. З невялікай прывітальнай прамовай звярнуўся да трыбун галоўны трэнер Бернд Штанге, прычым на рускай мове. Напрыканцы спытаў, ці зразумела ён размаўляе, за што сарваў бурныя апладысменты. Як заўсёды, вялікай папулярнасцю карыстаўся паўабаронца «Барселоны» Аляксандр Глеб. Дзякуючы ўсталяваным на стадыёне мікрафонам, балельшчыкі маглі задаць свае пытанні гульцам. Большасць пытанняў была менавіта да Глеба. Зусім юны футбаліст гадоў дзесяці пацікавіўся ў Аляксандра, за якую каманду той хварэў у дзяцінстве. Адказ быў — мадрыдскі «Рэал». Спыталі балельшчыкі, ці будзе Глеб удзельнічаць у матчы, прысвечаным 10-годдзю першай перамогі БАТЭ ў нацыянальным чэмпіянаце, і атрымалі станоўчы адказ. Хтосьці цікавіўся, калі Аляксандр прывязе кубак Лігі чэмпіёнаў у Мінск і ці прыедзе з ім у нашу сталіцу хтосьці з гульцоў «Барселоны». Аляксандр паабяцаў прывезці кубак, калі яму дадуць такую магчымасць у федэрацыі. І пажартаваў, што прыедзе Анры — «ён абяцаў».

У Бернда Штанге балельшчыкі напрамую спыталі: калі запросіце ў зборную Сяргея Крыўца. Галоўнаму трэнеру давялося шукаць адказ, маўляў, і так вялікую колькасць гульцоў адабраў у Анатоля Курненіна і адарваў іх ад падрыхтоўкі да моладзевага чэмпіянату Еўропы. А Сяргей у зборнай з'явіцца. Прыхільнікі не толькі футбола, але і хакея спыталі ў галоўнага трэнера, ці бывае ён на хакейных матчах, і Бернд прызнаўся, што хакей яму падабаецца, і ў вольны час з задавальненнем бывае на матчах.

Фота Аляксандра КРАЎЦА.

Не адыходзілі фанаты і ад варатароў зборнай Сяргея Верамко (у прыхільнікаў БАТЭ была яшчэ адна магчымасць сфатаграфавацца з героем матчаў леташняй Лігі чэмпіёнаў) і Юрыя Жаўнова. Як прызнаўся апошні, у ягоным клубе таксама наладжваюцца падобныя акцыі, футбалісты наведваюць дзіцячыя дамы і спартыўныя школы. Аднак балельшчыкаў у «Масквы» вельмі няшмат, а ў зборнай такое кантактаванне заражае станоўчымі эмоцыямі надоўга.

Падзяліцца ўражаннямі папрасілі і мы ўладальніка Кубка і «золата» чэмпіянату Іспаніі, а таксама сёлетняга пераможцу самых прэстыжных клубных спаборніцтваў Еўропы Аляксандра Глеба, калі апошні раздаў балельшчыкам усе свае карткі — нават тыя, якія разлічваліся для балельшчыкаў у Гродне.

— Аляксандр, растлумачце, ці сапраўды беларусы змогуць на свае вочы ўбачыць Кубак?

— У клубе мне сказалі, што яны не супраць, каб я прывёз яго на некалькі дзён у Мінск. І калі наша федэрацыя футбола возьме на сябе ўсе арганізацыйныя моманты, Кубак будзе ў Беларусі.

— Як у «Барселоне» праходзяць падобныя сустрэчы з балельшчыкамі?

— Там усё крыху па-іншаму. З балельшчыкамі мы спецыяльна не сустракаемся. Выключэнне было, калі мы праехалі на аўтобусе праз увесь горад пасля выйгрышу Лігі чэмпіёнаў. Там усё больш маштабна. Няма такіх акцый, каб кожны балельшчык мог падысці да цябе і ўзяць аўтограф. Яны падыходзяць прама на вуліцах, жадаюць удачы. Мы адзіны клуб у Каталоніі, я не лічу «Эспаньёл», і ўсе хварэюць за «Барселону». Футбалісты — вельмі папулярныя асобы.

— Гэта не напружвае?

— Ну хіба, крыху, бо каталонцы такі народ, што калі каманда прайграе, яны цябе ненавідзяць, калі ўсё добра, будуць насіць на руках. У нас у зборнай гэта толькі пачатак. І я лічу, гэта здорава, што любы ахвотны можа прыйсці, убачыць футбалістаў, спытаць у іх штосьці. Я ўдзячны людзям, якія сёння прыйшлі. Гэта прыемна не толькі для іх, але і для нас. Гэта выдатна для дзяцей, бо я таксама быў такім жа малым, прыходзіў і шырока адкрытымі вачамі глядзеў на гульцоў тых часоў. Шкада, што не ўдалося ўбачыць каманду «Дынама» 82-га года — тады я толькі нарадзіўся. Мне вельмі падабаліся Валік Бялькевіч і Хацкевіч. Толькі тады не было такіх акцый — глядзеў па тэлевізары і на стадыёнах і радаваўся. Марыў гуляць за зборную.

— Якія ўражанні засталіся ад сезона?

— Свой асабісты сезон я лічу няўдалым. А вось сезон каманды — наадварот. Анры правёў выдатны сезон — забіў 16 галоў. Тройка Это'о, Анры і Месі здорава выглядала сёлета. А ў мяне, мяркую, усё наперадзе. Вельмі хочацца гуляць у футбол. Я страціў упэўненасць за гэты год, але гэта не ўпершыню ў маёй кар'еры. Будзем ісці далей.

— Які горад больш падабаецца — Барселона ці Лондан?

— Барселона крыху адрозніваецца ад Лондана. Там свае перавагі — надвор'е проста ідэальнае. Безумоўна, Барселона прыгожы горад і яна мне падабаецца.

— Вы прынялі рашэнне застацца ў «Барселоне»?

— Пакуль канчатковага я не вырашыў. І ўсё будзе залежаць ад шэрагу фактараў. Кантракт у мяне яшчэ на тры гады.

Алена АЎЧЫННІКАВА.

ЦАЦКІ ДЗЯЦІНСТВА — У МУЗЕЙ!

Жыхары Віцебска і госці горада з задавальненнем прыносяць цацкі, з якімі гулялі ў дзяцінстве, у мясцовы Літаратурны музей. Ужо прынеслі дзясяткі самых розных цацак. Такіх арыгінальных акцый віцебскія музейныя работнікі яшчэ не праводзілі.

У музеі да Міжнароднага дня абароны дзяцей сфарміравалі незвычайную выставу «Цацкі нашага дзяцінства». Цікава, што ў тых, хто прынёс цацкі даўніх гадоў — часоў бабуль і дзядуляў, работнікі музея прасілі прынесці фотаздымкі і звесткі пра ўладальнікаў. Пасля таго, як выстава пройдзе (а адкрылася яна 1 чэрвеня), цацкі вернуць іх гаспадарам.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ШЛЯХ У НАВУКУ

Цырымонія ўзнагароджання лаўрэатаў Рэспубліканскага конкурсу навуковых работ студэнтаў ВНУ прайшла ў будынку рэктарата Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Удзел у ёй узялі прадстаўнікі Міністэрства адукацыі, Вышэйшай атэстацыйнай камісіі, Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях і Нацыянальнай акадэміі навук.

У 2008 годзе ўдзел у конкурсе ўзялі студэнты і выпускнікі 57 ВНУ і філіялаў. Аўтарамі навуковых работ былі апублікаваныя 3971 артыкул і 3758 тэзісаў дакладаў. Практычная значнасць работ удзельнікаў конкурсаў пацверджана 1495 актамі ўкаранення ў вытворчасць, 3226 актамі ўкаранення ў навучальны працэс, патэнтамі і заяўкамі на патэнты. Званне лаўрэата Рэспубліканскага конкурсу студэнцкіх навуковых работ былі ўдастоены 77 прадстаўнікоў 29 ВНУ нашай краіны.

Лепшымі прызнаныя 70 работ. Упершыню за час правядзення конкурсу аўтарам 12 работ былі прысвоены званні лаўрэатаў конкурсу менавіта за практычнае выкарыстанне атрыманых навуковых вынікаў. Пэўная колькасць канкурсантаў ужо шчыльна звязала свой лёс з навуковай дзейнасцю. З 77 лаўрэатаў 8 з'яўляюцца магістрантамі, многія прайшлі этап магістратуры, а 11 ужо сталі аспірантамі.

Надзея НІКАЛАЕВА.

РАТУЕМ СКУРУ АД... КАМП'ЮТАРА

Гадзіны і дні, праведзеныя за камп'ютарам, адбіваюцца не толькі на паставе і вастрыні зроку. Камп'ютар «атакуе» і нашу скуру. Электрастатычнае поле, якое ўтвараецца вакол уключанага манітора, сушыць скуру, выклікае яе лушчэнне, змяняе шчолачны баланс. Вакол манітора ўзнікае воблака са свабодных радыкалаў, што садзейнічае заўчаснаму старэнню. На нос, вейкі, бровы, шчокі камп'ютаршчыкаў асядае мноства брудных мікрачасцінак, з-за чаго скура страчвае вільгаць, з'яўляюцца прышчы, пагаршаецца эластычнасць. Маршчыны становяцца больш прыкметнымі. Ёсць некалькі спосабаў засцерагчыся ад гэтага.

Дапамагаюць скуры справіцца з пераналружаннем 5-хвілінныя перапынкі пасля кожнай гадзіны працы. У гэты час падыдзіце да адчыненага акна, зрабіце не менш як 7 глыбокіх удыхаў, столькі ж разоў надзьміце і расслабце шчокі. Выпіце некалькі глыткоў вады, у якую можна дадаць сок лімона або грэйпфрута. Такі кактэйль падсілкуе скуру знутры: цытрусавыя — выдатныя антыаксіданты, аказваюць танізуючае дзеянне. Добры сродак — зялёны чай. Піце яго замест кавы. Два-тры кубкі зялёнага чаю нейтралізуюць шкоднае выпраменьванне, атрыманае за ўвесь працоўны дзень. Сачыце, каб у пакоі, дзе вы працуеце, паветра не было сухім.

Тым, хто працуе за дысплеем, варта ў любы час года карыстацца ўвільгатняльнымі крэмамі. **Акрамя таго:**

— пастарайцеся выключыць кантакт скуры твару з вадой з-пад крана. Умывайцеся гатаванай, у якую дабаўлены лімонны сок, або мінеральнай вадой, або раслінымі настоямі (напрыклад: ліпы, рамонку, мяты, шалфею). Пры сухой адчувальнай скуры добра мыць твар малаком, якое змешана з вадой пакаёвай тэмпературы ў суадносінах 1:1. Выдатны сродак супраць абязводжвання скуры — умыванне ржаным хлебам: акрайчык заліце гарачай вадой і пасля астывання працадзіце;

— працірайце твар скрылікам свежага яблыка;

— каб «умацаваць» далікатную скуру вакол вачэй, на ноч выконвайце такое практыкаванне: паспрабуйце расплюшчыць вочы, не размыкаючы век;

— рабіце салявыя або хвойныя кампрэсы: мяккі ручнік, змочаны ў цёплым растворы, трымайце на твары 5—7 хвілін;

— увядзіце ў штодзённы рацыён памідоры і капусту: менавіта гэтыя прадстаўнікі агародніны лепш за ўсё засцерагаюць скуру ад шкоднага ўздзеяння камп'ютара.

Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.

БАЧУ — НЕ БАЧУ

Рэжысёр Святлана Залеская-Бень (ці проста Бенька, як яе называюць усе навокал) паставіла ў Беларускім дзяржаўным тэатры лялек казку Астрыд Ліндгрэн «Пэпі Доўгаяпанчоха». І шмат чаго яшчэ цікавага паставіць, толькі мы з вамі пабачым не ўсё...

Чароўны чамадан

Бенька шпарка шыбуе мне насустрач. Здалёк усміхаецца і махае рукой. У Бенькі ёсць адна цікавая рыса характару — яна прыводзіць у захапленне ўсіх, каго сустракае. Першае, што я раблю павітаўшыся, — камплімент яе кедам (чырвоным у белыя гарохі). Праз колькі крокаў мы сустракаем рабочага сцэны.

— Ого! Які ў вас чамадан, — ківае ён галавой на невялікі сіні чамадан, які Бенька нясе ў руках. — У мяне ёсць падобны.

— І што вы там захоўваеце? — адразу ж пытаецца вядомая знаўца прыроды чамаданаў і іх калекцыянерка.

— Гайкі і вінцікі розныя.

Бенька ківае галавой. Але для мяне застаецца незразумелым: падыходзіць чамадан для захавання такога «скарбу» ці не падыходзіць? Запытацца я не паспяваю, бо мы ўжо ў тэатры. Бенька адкідае накрыўку свайго сіненькага чамадана, перакладае там нейкі важкі том, выцягвае са стосу папер тэкст інсцэніроўкі пра Пэпі і пачынае генеральную рэпетыцыю.

Пэпі: траўмы і радасці

Пасля першага прагону, дзе толькі мне адной дасталося ўсе патузванні косак Пэпі, усё шчасце ад знаходкі Кукарамбы, усе паветраныя пацалункі цыркавых асілкаў і ўсе погляды строгай настаўніцы, мы з Бенькай размаўляем пра Пэпі ў прыватнасці і пра лялечны тэатр увогуле.

— Для таго, каб дзяўчынка Пэпі з'явілася, Астрыд Ліндгрэн давялося зламаць нагу — толькі тады ў яе знайшоўся вольны час, каб запісаць гэту гісторыю. Якіх ахвяраў лёс запатрабаваў ад вас, каб Пэпі з'явілася на тэатральнай сцэне?

— О! Мне давялося зламаць галаву. І гэтая траўма яшчэ не зажыла (*смяецца*). Самая галоўная праблема ў тым, што «Пэпі Доўгаяпанчоха» мне падаецца кніжкай для дарослых, у якіх ёсць маленькія дзеці. Пэпі — гэта квінтэсэнцыя гульнявой прыроды чалавека. Яна ўвесь час знаходзіцца ў стане гульні. Дзяцей гэтаму вучыць не трэба, гэта і так закладзена ў іх, гэта трэба ўзгадаць дарослым. Таму паставіць казку для дзяцей было вельмі цяжка. Мне давялося фактычна напісаць сваю гісторыю пра Пэпі, якая пасля шматлікіх-шматлікіх-шматлікіх дапрацовак цяпер ідзе на сцэне.

Увогуле, мне падаецца, што Пэпі — гэта персанаж, на які трэба раўняцца ўсім, асабліва тым, хто працуе з дзецьмі. Пэпі — гэта ідэальны педагог. Яна дапамагае дзецям пераадолець жыццёвыя цяжкасці, ніколі не журыцца і правільна, па-філасофску ставяцца да тых рэчаў, якія насамрэч не з'яўляюцца самымі галоўнымі ў жыцці (а чалавек з-за розных бязглуздых установак пачынае прыдумляць сабе праблемы). Для Пэпі ўсё проста: падлога мыецца разлівам вады, бліны робяцца на падлозе. Але жыццё цудоўнае і лёгкае! Мне здаецца, што менавіта такога падыходу да жыцця і не хапае цяпер людзям.

— А вы — Пэпі?

— Я? (Твар Бенькі на імгненне ахоплівае задуменна-здзіўлены выраз. — **У. Л.**) Я, напэўна, была ёй зачаравана з дзяцінства. Потым я не чытала гэтую кнігу шмат гадоў, а калі перачытала, то зразумела: яна кіравала мной па жыцці. У нас шмат агульных рысаў, якія я не старалася капіраваць, а якія проста неяк падсвядома заселі ўва мне, і ад іх ніяк не пазбавіцца. А! І пасля прачытання гэтай казкі я вырашыла ніколі не казаць нудную праўду. Я вырашыла ўвесь час хлусіць (*смяецца*).

— У кнізе Пэпі ў кожным раздзеле трапляла ў розныя пераплёты, у сутычкі з палісмэнамі і бандытамі. У спектаклі гэтага не засталося. Чаму? Вы ж так любіце розныя гісторыі і пераплёты?

— Па-першае, ад гэтых авантур гісторыя на сцэне страціла б цэльнасць. Па-другое, па кніжцы Пэпі можа ўвогуле трактавацца як асацыяльны тып: дзевяцігадовая дзяўчынка жыве адна, без бацькоў; да яе ўрываюцца бандыты, а яна танчыць з імі твіст. Калі дзіця пачне паўтараць такія паводзіны, гэта можа быць проста небяспечна для яго жыцця. Па-трэцяе, у часы Астрыд Ліндгрэн дзеці былі вельмі заціснутыя. Аўтарытарнае выхаванне. Бясспрэчнае падпарадкаванне старэйшым. Цяпер час змяніўся. Бацькі сталі сябрамі, а не бажаствамі, якім трэба толькі падпарадкоўвацца. І сёння дзеці спрачаюцца, дзеці хамяць. Гэта часам пераходзіць межы сяброўства і пераўтвараецца ва ўседазволенасць дзіцячую, рэч непрыемную і нават страшную. Таму гэтая кніга, дзе дзіця паводзіць сябе бескантрольна, не думае пра астатніх, нясе ў сабе нейкую шкодную інфармацыю. І сёння казку трэба разглядаць зусім пад іншым вуглом, чым у часы Астрыд Ліндгрэн.

— У лялечным тэатры кожны спектакль — гэта асобны свет. Кожны спектакль мае сваю асаблівасць. Чым адметная «Пэпі Доўгаяпанчоха»?

— Тым, што спачатку на конкурс дзіцячага малюнка, які праводзіў клуб «Таленты і прыхільнікі», была заяўлена тэма: найлепшы эскіз да спектакля. Ніхто нічога такога не планаваў — проста прапанавалі дзецям паразважаць, як бы мог выглядаць гэты спектакль. Але эскіз адной дзяўчынкі, Тані Шадрынай, нас вельмі натхніў і парадаваў. Я сказала: «Гэта ж сапраўдная Пэпі!». І галоўны рэжысёр Аляксей Леляўскі сказаў: «Чаму б не? Чаму б нам не запрасіць дзяўчынку быць мастаком?». Безумоўна, мастаком спектакля не можа быць чалавек, які не ведае тэхналогіі, працэсу стварэння лялек і пастаноўкі, тым больш не можа быць дзесяцігадовае дзіця. Але яе малюнкі сталі камертонам для спектакля, і большасць лялек выканана па яе эскізах. Астатняе зрабілі мастакі-прафесіяналы з дзіцячым бачаннем свету — Антаніна Слабодчыкава і Міхал Гулін. І гэтая стылістыка дзіцячага малюнка была імі вытрымана ў касцюмах і дэкарацыях. Нам вельмі хацелася, каб спектакль быў увасабленнем дзіцячай гульнявой прыроды: яркай, сонечнай, абсурднай, неверагоднай, крыху недарэчнай, крыху шалёнай.

Увогуле, гэтая ідэя выкарыстання дзіцячага малюнка вельмі цікавая. І асабіста мне хацелася б далей папрацаваць у гэтым кірунку. Можа быць, з якім-небудзь дзіцячым калектывам і, можа быць, без прафесійных мастакоў, абапіраючыся толькі на геніяльнасць і дасканаласць дзіцячага малюнка.

Мне вельмі хочацца верыць, што гэтыя Бенькіны эксперыменты мы з вамі зможам пабачыць. І прычына тут зусім не ў тым, што праект знаходзіцца пакуль у стане задумы...

Чарвяк сумнення

У закуліссі лялечнага цяпер шмат гавораць пра «Чарвякоў». Гэта фестывальны праект, у якім Бенька разам з калегамі даследуе прыроду чарвяка і такіх з'яваў, як разбурэнне, гніенне і смерць. Спектакль для дарослых, які гэтым летам пабачаць у Германіі, у Польшчы, у іншых краінах і, хутчэй за ўсё, не пабачаць у Беларусі. Таму што яго проста няма дзе паказаць — у лялечнага тэатра няма камернай пляцоўкі, на якую сёння арыентавана большасць еўрапейскіх спектакляў. І гэта, на жаль, не адзіная праблема...

— Мне здаецца, — дзеліцца сваімі думкамі Бенька, — што ідэя вялікага дзяржаўнага лялечнага тэатра досыць далёкая ад руху насустрач гледачу. Таму што робіцца нейкі спектакль, і рэжысёр, і ўся пастановачная частка заціснуты рамкамі таго, што ім трэба зацікавіць досыць вялікую і досыць розную ў сваіх цікавасцях колькасць людзей. А калі тэатрык маленькі і ставіць сваёй мэтай сабраць на пастаноўку 50 чалавек, ён можа дазволіць сабе рабіць асаблівыя спектаклі, разлічваючы, што туды прыйдзе асаблівая публіка. Напрыклад, мой любімы тэатр «Цень» у Маскве. Туды на паказы ходзіць не больш за шэсць дзяцей. І білеты каштуюць дорага, але бацькі, якім хочацца, каб іх дзіцяці запомнілася свята, іх купляюць. Дзеці прыходзяць туды, і іх чакае сапраўдны цуд, ні ў якім разе не падобны на нашы заказныя ранішнікі. Яны трапляюць у чароўнае памяшканне, дзе стаяць клеткі з птушкамі, бялюткая падлога распісана вершамі, на сценах жывуць карціны і калекцыя слонікаў з розных краін свету. Іх кормяць смачным тортам, зробленым па адмысловаму рэцэпце. Потым ім паказваюць кіно пра краіну Ліліканію, дзе жывуць маленькія чалавечкі (яно знята з выкарыстаннем лялек і асабліва зманціравана). Дзеці глядзяць гэтую гісторыю, п'юць гарбату, потым ідуць у маленькую залу, дзе спектакль іграюць трох-, пяцісантыметровыя лялькі. І гэта вельмі незвычайныя спектаклі. У адным, напрыклад, за ўсіх лялек чытаў акцёр Сяргей Юрскі, і на ўсіх лялькаў быў налеплены ягоны партрэт. Гэты тэатр разлічаны на эстэтаў. Іх невялікая колькасць, але і тэатр невялікі, спектаклі распісаныя на год наперад, і людзі хадзілі і будуць хадзіць. Мне здаецца, што вось яно, выйсце — тэатр павінен мець лакальную публіку, калі ён хоча рабіць нешта нестандартнае і цікавае. Калі ён вымушаны ставіць для 250 школьнікаў, якія прыйдуць у залу, з якіх толькі адзін можа і чуў імя Юрскага, то што можа зрабіць тэатр? Нічога авангарднага. Ісці на эксперымент вельмі рызыкоўна. Мы робім для сярэднестатыстычных дзяцей, якіх насамрэч няма. І гэты спектакль будуць глядзець дзеці вельмі тонкія і цікавыя — ім будзе сумна, дзеці, якія яшчэ да яго не дараслі — ім будзе незразумела, і дзеці, якім пастаноўка прыйшлася своечасова.

— А ёсць нейкія змены ў лепшы бок?

— Я думаю, што гэта сітуацыя не зменіцца ніколі. І я імкнуся ісці па шляху сумяшчэння агульнадаступнасці і нейкага эстэтычнага ўзроўню. Мне здаецца, што так робіць большасць беларускіх рэжысёраў. І гэта ратуе тэатр ад знікнення і ад канчатковага скочвання да «шрэкаўшчыны».

Мы даканчваем размову — акцёры ў квяцістых цыліндрах клічуць рэжысёра на другі прагон. На развітанне Бенька кажа: «Я думаю, што з кожным годам будзе ўсё складаней. І ўсе людзі тэатра павінны мець вялікую мужнасць. Вялікую мужнасць, каб займацца сваёй прафесіяй...»

Ульяна ЛАПЦЕВА.

Ёсць думка

Як адпачывае моладзь?

Гэта пытанне праблемнае і нават філасофскае, як, зрэшты, і адпачынак кожнага іншага чалавека. Гэта можа быць выхад у пяць гадзін раніцы на балкон з гантэляй у руцэ. А можа — паход на рок-канцэрт альбо ў аквапарк. Мяркую, што спярша варта вылучыць сярод моладзі пэўныя катэгорыі людзей, каб прасцей было разабрацца ў тым, чаму яны аддаюць перавагу.

Большасць юнакоў і дзяўчат ахвотней адпачываюць у кампаніі сяброў і знаёмых. І галоўным крытэрыем добрага адпачынку, вядома ж, лічыцца магчымасць павесяліцца. Верагодна, маладымі людзьмі пры гэтым кіруе нястрымнае жаданне адарвацца ад тых праблем, якія прыгнятаюць іх у штодзённым жыцці, і ў вясёлай кампаніі набрацца станоўчых эмоцый. Як правіла, для гэтага яны збіраюцца ў так званых «пажыўных месцах» (дыскатэкі, бары, казіно). У асноўным гэта моладзь, якую можна падзяліць на тры катэгорыі: мажоры, сераднякі і тусоўшчыкі. Паспрабуем сцісла прааналізаваць кожную катэгорыю.

Мажоры. Іх яшчэ ў эпоху перабудовы называлі «голдэнамі», альбо «залатымі хлопчыкамі». Яны гуляюць на грошы, зарабленыя бацькамі. Валодаюць гіпертрафаваным пачуццём самаўпэўненасці і ганарлівасці. Звычайна вельмі дасведчаныя, але пры гэтым пасіўныя ў гутарцы. Спрабуюць пераймаць тыпаж Пячорына ці Абломава, хоць гэта ў іх дрэнна атрымліваецца. Калі з імі вядзеш размову, складваецца ўражанне, што яны пазіраюць не на цябе, а ў люстэрка — верагодна, з-за таго, што празмерна клапоцяцца пра ўздзеянне (перш за ўсё знешняе), якое яны робяць на суразмоўніка.

Сераднякі. Маладыя людзі гэтай катэгорыі паходзяць звычайна з перыферыі альбо са звычайных рабочых сем'яў. Ім цікава ўсё: як пасядзець у бары, так і схадзіць у кіно ці на выставу. Яны з'яўляюцца самымі ўдзячнымі наведвальнікамі любых грамадскіх устаноў. Любяць фатаграфавацца, напрыклад, на фоне Нацыянальнай бібліятэкі.

ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ ОБЪЕКТА ДОЛЕВОГО СТРОИТЕЛЬСТВА

ООО «ДИНАСИСТЕЙТ» информирует юридических и физических лиц о создании объекта долевого строительства.

ЗАСТРОЙЩИК (заказчик) – ООО «ДИНАСИСТЕЙТ»

Зарегистрировано решением Минского городского исполнительного комитета от 28 сентября 2000 г. № 1097, в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 100984486. Застройщиком осуществлено строительство жилых домов по адресу: г. Минск, ул. Крупской, д. 23 и д. 25, ул. Кулешова, д. 76.

Адрес: 220007, г. Минск, ул. Аэродромная, 125, помещение 1, комната 12, телефон 2245129. Режим работы по вопросам долевого строительства: понедельник–пятница: с 09.00 до 17.00, выходные дни – суббота, воскресенье.

Цель проекта строительства – исполнение решений Мингорисполкома «Об изъятии и предоставлении земельного участка и разрешении строительства» № 251 от 14 февраля 2008 г. и № 539(1) от 20 марта 2008 г. на строительство объекта «Жилые дома № 4 и 5 (не относящиеся к домам повышенной комфортности) по генплану по ул. Крупской с устройством административных помещений в цокольных этажах в составе объекта «2-я очередь реконструкции жилой усадебной застройки в границах ул.Плеханова – Малинина – Крупской – прибрежной зоны р. Слепянка».

Объект долевого строительства – жилые дома (ж/д № 4 по генплану – 3-секционный, ж/д № 5 по генплану – 2-секционный) представляют собой 5-этажные жилые дома с размещением в цокольном этаже административных помещений. Здания запроектированы на основе безригельной каркасной системы с плоскими монолитными дисками перекрытия. Каркас и перекрытия – монолитный железобетон. Наружные стены и внутренние перегородки – керамзитобетонные блоки. Оконное заполнение и остекление лоджий – изделия ПВХ. Кровля – плоская, покрытие – рулонные материалы. Проезды, площадки, тротуары – асфальтобетон, тротуарная плитка. Для отопления жилого дома принята поквартирная система с установкой индивидуальных источников отопления. Высота этажа – 2,7 м. Наружная отделка – утепление стен, штукатурка, покраска акриловыми красками. Цоколь здания – облицовка естественным камнем.

Жилая часть: общая площадь квартир за вычетом площади передаваемой Мингорисполкому в счет усредненного сноса – 4781 м² (56 квартир).

Административная часть: общая площадь помещений – 900,86 м².

Общая стоимость жилой части и административных помещений в базисных ценах 1991 г. составляет 6608,517 тыс. руб.

Состав общего имущества в многоквартирном жилом доме, которое будет находиться в общей долевой собственности дольщиков после ввода объекта в эксплуатацию:

межквартирные лестничные клетки, лестницы, вентшахты, коридоры, крыши, другие места общего пользования, несущие, ограждающие ненесущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых домов и (или) нежилых помещений, элементы озеленения и благоустройства, а также иные объекты недвижимости, служащие целевому использованию здания, поступают в общую собственность дольщиков.

Для заключения договоров долевого строительства предоставляются:

А) Квартиры в жилом доме № 5 по генплану:

- двухкомнатная, первая секция, третий этаж, строительный № 7, площадь квартиры по СНБ 3.02.04-03 – 67,76 м², стоимость — 234 986 540 рублей.

Начало строительства многоквартирных жилых домов – 1-й квартал 2008 г., окончание – 2-й квартал 2009 г.

Условия ознакомления застройщиком дольщиков с объектом долевого строительства и ходом работ по его строительству: по согласованию с Застройщиком.

Застройщиком получены:

- разрешение на проведение проектно-изыскательских работ – Акты выбора земельного участка от 11 мая 2007 г. и от 11 сентября 2007 г.;
- решения Минского городского исполнительного комитета от 14 февраля 2008 г. № 251, от 20 марта 2008 г. № 539 (1) о разрешении строительства объекта;
- свидетельство (удостоверения) о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права постоянного пользования на него № 500/31-3424 от 03.06.2008 г.;
- свидетельство (удостоверения) о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права постоянного пользования на него № 500/31-3425 от 03.06.2008 г.;
- свидетельство (удостоверения) о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права постоянного пользования на него № 500/31-3426 от 03.06.2008 г.;
- свидетельство (удостоверения) о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права временного пользования на него № 500/31-3427 от 03.06.2008 г.;
- проектно-сметная документация, прошедшая в установленном порядке государственную экспертизу, заключение РУП «Белгосэкспертиза МАС» от 13 февраля 2008 г. № 381-7/08;
- государственная экологическая экспертиза объекта от 20 ноября 2007 г. № 715-2007;
- договор строительного подряда № 25/02-2008 от 19 февраля 2008 г. с ИП «Восточная строительная компания»;
- выданное органом государственного строительного надзора разрешение на проведение строительно-монтажных работ от 26.03.2008 г. № 2-201-Ж-062/07.

Объект находится в залоге у банка для обеспечения исполнения обязательств Застройщика по кредитному договору на финансирование строительства объекта. Застройщик обязуется при условии своевременной и полной оплаты Дольщиком объекта долевого строительства передать его Дольщику свободным от каких-либо обременений.

Уточнение к проектной декларации, опубликованной в газете «Звязда» № 240 (26353) от 19.12.2008 слова: «Квартиры в жилом доме № 4 по генплану:

- однокомнатная, первая секция, первый этаж, строительный № 14, площадь квартиры по СНБ 3.02.04-03 – 44,58 м², стоимость — 159 531 900 рублей»;

читать: «Квартиры в жилом доме № 5 по генплану:

- однокомнатная, вторая секция, второй этаж, строительный № 17, площадь квартиры по СНБ 3.02.04-03 – 44,63 м², стоимость — 159 691 400 рублей».

БЕЛАРУСЬ СПАДЗЯЕЦЦА АТРЫМАЦЬ ПРАВА НА ЭКСПАРТ МАЛОЧНАЙ І РЫБНАЙ ПРАДУКЦЫІ Ў ЕЎРАСАЮЗ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Дакумент з вынікамі праверкі пакуль што знаходзіцца ў бюро ветэрынарыі, у найбліжэйшы час плануем перадаць яго для разгляду ў Еўрапарламент. Інспектары лічаць, што ў нашых прадпрыемстваў ёсць усе перадумовы, каб атрымаць права выхаду на еўрапейскі рынак. Спадзяёмся на падтрымку міністэрстваў сельскай гаспадаркі Польшчы і Латвіі.

Паводле слоў Тамары Усачовай, экспартныя цэны на малочную прадукцыю ўпалі ў два разы. Таму асноўная задача, якая сёння стаіць перад беларускімі прадпрыемствамі,— шукаць новыя рынкі збыту айчыннай прадукцыі. Не ўсе прадпрыемствы тут працуюць на поўную моц. Правільна вядуць маркетынгавую палітыку такія прадпрыемствы, як «Савушкін прадукт», «Кобрынская птушкафабрыка», «Бабушкина кринка», «Гродзенскі мясакамбінат», «Ваўкавыскі мясакамбінат». Астатнім ёсць чаму ў іх павучыцца. Выстава дае такую магчымасць.

Падчас складанай эканамічнай сітуацыі ў свеце цяжка рабіць нейкія доўгатэрміновыя прагнозы. Ці можна было, напрыклад, летась прагназаваць, што мы будзем пастаўляць малочную прадукцыю (сухое малако і масла) ва Украіну (там сёння назіраецца спад вытворчасці малака).

— Мы ж, наадварот, нарошчваем вытворчасць малака, — падкрэсліў **памочнік міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Беларусі Казімір РАМАНОЎСКІ.** — Ужо пяты год у дзень дабаўляем па 1 літру. Таму суседняя краіна без малака не застанецца — маецца ў Беларусі экспартны патэнцыял. Пачалі добра спажываць нашу малочную прадукцыю і кітайцы. Ідзе работа з Венесуэлай (заключаны кантракт на пастаўку ў Венесуэлу 7 тыс. тон сухога натуральнага малака), з Алжырам, з Іранам, з Туркменіяй.

— Актыўна апошнім часам сталі працаваць на казахстанскім рынку, — дадала Тамара Усачова. — Гэта звязана, у першую чаргу, з увядзеннем тэхнічнага рэгламенту па малацэ ў Расіі. Таму прадпрыемствам давялося шукаць новыя рынкі збыту. За першы квартал у Казахстан адгружана ў 1,7 раза больш тавараў, чым за адпаведны перыяд мінулага года. Экспартныя пастаўкі вялі 18 прадпрыемстваў. У структуры экспарту больш за 70 % займаюць малако і смятанка, больш за 15 % — сыры і тварог, 12,7 % — масла.

— Нам трэба рабіць націск на павышэнне якасці нашай прадукцыі, — адзначыў Казімір Раманоўскі. — Бо якасць прадукцыі вызначае цану на міжнародным рынку. Вось расійскі бок папрасіў павялічыць колькасць беларускіх сыроў, якія пастаўляюцца на расійскі рынак, і знізіць аб'ём паставак сухога малака. Як вядома, абсталяванне для вырабу сыроў даволі дарагое. Мы набываем самае лепшае, каб сёння быць канкурэнтаздольнымі па якасці. Акрамя таго, у час крызісу трэба эканоміць сродкі. Мы ж часам іх расходуем неэфектыўна.

Надзея ДРЫЛА.

Ёсць пытанне

На дэманстрацыйным полі ў ААТ «Гастэлаўскае» няма куды пеўню дзюбнуць. Сюды з усіх куткоў свету з'ехаліся людзі, якіх аб'ядноўвае любоў да сельскай гаспадаркі. Падрабязней аб мэтах свайго прыезду расказваюць самі наведвальнікі выставы.

Канстанцін ШКУЛЬ, пенсіянер з Мінска:

— Ад бацькоў застаўся домік у Мачулішчах. Мару там разводзіць свойскую птушку. Вось на выставе ўжо нагледзеў дарагіх пародзістых курэй. Даведаўся, як іх патрэбна даглядаць, чым карміць. Радуе, што можна не толькі выбраць тавар, але і атрымаць бясплатную кансультацыю. Тут сабраліся не проста спецыялісты, а аматары сваёй справы. Яны ведаюць адказы на ўсе пытанні, толькі пытацца паспявай. Для самаразвіцця планую пазнаёміцца з навінкамі сельскагаспадарчай тэхнікі.

Кацярына БОБРЫК і Ганна ЕФІМОВІЧ, студэнткі Сенніцкага каледжа харчовай прамысловасці:

— У нас цяпер вучэбная практыка. Вось мы і прыехалі паглядзець на тую тэхніку, пра якую нам расказваюць на занятках. Тэорыя, бясспрэчна, гэта добра. Але лепш адзін раз убачыць, чым сто разоў пачуць.

Наталля ПАРХАМЕЦ, жывёлавод з Чачэрскага раёна:

— Мяне сюды прывяла як асабістая, так і прафесійная цікавасць. Жыву ў прыватным доме, таму планую што-небудзь набыць для ўласнай гаспадаркі. Нягледзячы на тое, што па роду дзейнасці я жывёлавод, вельмі люблю кветкі, садовыя дрэвы. З нашага раёна сюды прыехала цэлая дэлегацыя. Сярод нас ёсць і аматар трусоў. Так што, магчыма, назад будзем вяртацца з пародзістым трусом.

Вольга ДЗЕЦЮКОВА з Самахвалавічаў, дачка фермера:

— Дзеля сына прыехалі сюды з мужам. Стасу вельмі падабаецца тэхніка, ад сеялак не адарваць. Самім таксама цікава паглядзець на страусаў, дрэсіраваных парасят, спаборніцтвы паміж пеўнямі.

СПАЛЬНЯ НА САСНОВЫХ ГАЛІНАХ — АРЫГІНАЛЬНЫ СПОСАБ ПАЗБАВІЦЦА АД НЕМАЧЫ

Паводле сцвярджэння пенсіянера Уладзіміра Дзянісавіча Філіповіча, спальня на соснах — гэта рэцэпт амаль ад усіх хваробаў. Незвычайнае збудаванне пенсіянер зрабіў у лесе на галінах сасны 20 гадоў таму. Да гэтага Уладзіміра Дзянісавіча мучылі моцныя галаўныя болі. Безвыніковыя хаджэнні да дактароў прывялі яго да незвычайнага рашэння — паспрабаваць спаць у лесе. Пастаянны начлег зімой і летам даў добрыя вынікі: прапалі хранічныя сардэчнае захворванне і галаўны боль. Акрамя гэтага Уладзімір Дзянісавіч упарта займаецца фізкультурай і танцуе на хадулях.

Фота Уладзіміра ЧАБЕРКУСА, БЕЛТА.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТОВ РЕСПУБЛИКАНСКОЙ СОБСТВЕННОСТИ И АПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ ДЛЯ ОБСЛУЖИВАНИЯ ПРОДАВАЕМОГО НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА

Продавец недвижимого имущества по лотам № 1, № 2, № 3	Дочернее унитарное предприятие «Автобусный парк № 4» г. Волковыск Республиканского автотранспортного унитарного предприятия «Гроднооблавтотранс», контактные телефоны: (8-01512) 2-14-41, 2-06-11
Предмет аукциона	**Лот № 1** **Капитальное строение № 410/С-15286, часть капитального строения № 410/С-20365 и право заключения договора аренды земельного участка**
Место нахождения объектов	Гродненская область, г. Волковыск, ул. Зенитчиков, 27
Начальная цена предмета аукциона, тыс. рублей	122 358,214
Сумма задатка, тыс. рублей	12 235,000
Характеристика объектов недвижимого имущества	**Здание цеха платных услуг** – 1983 года постройки, двухэтажное, примыкающее к хозяйственным складам и пристройке к вспомогательному корпусу, общая площадь 775,4 кв. м; фундамент бутобетонный, наружные, внутренние капитальные стены и перегородки кирпичные, перекрытия чердачные и междуэтажные – железобетонные плиты; крыша совмещенная, рулонная; полы бетонные. Водопровод – стальные трубы, канализация – чугунные трубы, имеется канализационный выпуск с отстойником; электроосвещение – скрытая проводка. **Часть проездов асфальтобетонных** – 1980 года постройки площадью 96 кв. м
Условия использования недвижимого имущества	Вовлечение в хозяйственную деятельность, создание не менее 10 рабочих мест в течение 1 года с момента заключения договора купли-продажи
Информация о земельном участке (площадь, срок аренды)	Земельный участок с кадастровым номером 420850100001006723 площадью 0,0776 га, срок договора аренды 50 лет
Условия использования земельного участка; ограничения по его использованию	Получение победителем аукциона в установленном порядке разрешения райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработки строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий двух лет; осуществление строительства объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией; осуществление в двухмесячный срок после принятия решения райисполкома о предоставлении победителю аукциона земельного участка, государственной регистрации права на земельный участок
Предмет аукциона	**Лот № 2** **Капитальное строение № 410/С-15284, часть капитального строения № 410/С-20365 и право заключения договора аренды земельного участка**
Место нахождения объектов	Гродненская область, г. Волковыск, ул. Зенитчиков, 27
Начальная цена предмета аукциона, тыс. рублей	80 278,873
Сумма задатка, тыс. рублей	8 027,000
Характеристика объектов недвижимого имущества	**Пристройка к вспомогательному корпусу с подвалом** – 1987 года постройки, здание одноэтажное с подвалом, пристроенное к вспомогательному корпусу и зданию цеха платных услуг, общая площадь 147 кв. м, в том числе подвала 50 кв. м; фундамент – сборные железобетонные блоки, наружные, внутренние капитальные стены и перегородки – кирпичные; перекрытия – частично железобетонные панели, частично деревянные; крыша – совмещенная рулонная, полы – бетонные, имеются металлические ворота. Электроосвещение – скрытая проводка. **Часть проездов асфальтобетонных** – 1980 года постройки, площадью 500 кв. м
Условия использования недвижимого имущества	Вовлечение в хозяйственную деятельность, создание не менее 3 рабочих мест в течение 1 года с момента заключения договора купли-продажи
Информация о земельном участке (площадь, срок аренды)	Земельный участок с кадастровым номером 420850100001006722 площадью 0,1837 га, срок договора аренды 50 лет
Условия использования земельного участка; ограничения по его использованию	Получение победителем аукциона в установленном порядке разрешения райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработки строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий двух лет; осуществление строительства объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией; осуществление в двухмесячный срок после принятия решения райисполкома о предоставлении победителю аукциона земельного участка, государственной регистрации права на земельный участок
Предмет аукциона	**Лот № 3** **Капитальное строение № 410/С-15282, часть капитального строения № 410/С-20365 и право заключения договора аренды земельного участка**
Место нахождения объектов	Гродненская область, г. Волковыск, ул. Зенитчиков, 27
Начальная цена предмета аукциона, тыс. рублей	114 406,443
Сумма задатка, тыс. рублей	11 440,000
Характеристика объектов недвижимого имущества	**Хозяйственный склад** – 1989 года постройки, одноэтажное здание с двумя бетонными крыльцами, примыкающее к зданию цеха платных услуг, общая площадь 198,4 кв. м; фундамент – сборные железобетонные блоки; наружные, внутренние капитальные стены и перегородки – кирпичные; перекрытия чердачные – железобетонные плиты; крыша – совмещенная, рулонная; полы – бетонные; имеются металлические ворота. Электроосвещение – наружная проводка. **Площадка (асфальтобетон)** – 1980 года постройки, площадью 578,2 кв. м. **Часть проездов асфальтобетонных** – 1980 года постройки, площадью 242 кв. м. **Ограждение (сплошные железобетонные панели)** – 1980 года постройки, протяженностью 27,8 м, высотой 2,3 м. **Ограждение (сплошные железобетонные панели)** – 1980 года постройки, протяженностью 58 м, высотой 1,8 м
Условия использования недвижимого имущества:	Вовлечение в хозяйственную деятельность, создание не менее 3 рабочих мест в течение 1 года с момента заключения договора купли-продажи
Информация о земельном участке (площадь, срок аренды)	Земельный участок с кадастровым номером 420850100001006721 площадью 0,2626 га, срок договора аренды 50 лет
Условия использования земельного участка; ограничения по его использованию	Получение победителем аукциона в установленном порядке разрешения райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработки строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий двух лет; осуществление строительства объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией; осуществление в двухмесячный срок после принятия решения райисполкома о предоставлении победителю аукциона земельного участка, государственной регистрации права на земельный участок
Продавец недвижимого имущества по лоту № 4	Государственное учреждение «Барановичское эксплуатационное управление Вооруженных Сил», контактные телефоны: (8-0152) 77-32-05, (8-0163) 41-25-92
Предмет аукциона	**Лот № 4** **Кафе с подвалом № 400/С-3850, асфальтобетонное покрытие с бортовым камнем № 400/С-35690 и право заключения договора аренды земельного участка**
Место нахождения объектов	Военный городок № 76а, Гродненский район, дер. Новая Гожа
Начальная цена предмета аукциона, тыс. рублей	65 977,022
Сумма задатка, тыс. рублей	6 597,000
